Аўтар: кс. Ян Раманоўскі
19.01.2014 00:00



У 1917 г. у Фаціме (Партугалія) мелі месца аб’яўленні Маці Божай, падчас якіх Панна Марыя прадказала гісторыю чалавецтва ў XX стагоддзі, пераслед Касцёла і яго адраджэнне.

У 2017 г. будзе святкавацца юбілей 100-годдзя фацімскіх аб’яўленняў.

Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі зацвердзіла трохгадовы цыкл падрыхтоўкі да юбілею. Зыходзячы з фацімскіх аб’яўленняў, год 2014 будзе Годам малітвы, 2015 – Годам навяртання, 2016 – Годам надзеі. Гэтае рашэнне было прынята на 55-ым пленарным пасяджэнні Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі, якое адбылося 22 лістапада 2013 г. у Пастаральным цэнтры ККББ у Мінску. 13 мая 2009 г. у каталіцкім Касцёле ў межах падрыхтоўкі да 100-годдзя аб’яўленняў Маці Божай у Фаціме распачалася Вялікая Фацімская Навэнна. Яна павінна дапамагчы ў духоўнай падрыхтоўцы да ўспаміну такой вялікай падзеі з гісторыі каталіцкага Касцёла XX стагоддзя, якой было аб’яўленне Маці Божай тром дзецям у партугальскім гарадку Фаціма 13 мая 1917 г. Падрыхтоўка да гэтай значнай падзеі мае таксама сваё вымярэнне і ў Касцёле Беларусі. Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі зацвердзіла трохгадовы цыкл падрыхтоўкі да гэтага юбілею. Абапіраючыся на Фацімскае пасланне, было прынята рашэнне, што 2014 год будзе Годам малітвы, 2015 – Годам навяртання, а 2016 – Годам надзеі. Аднак пачнём спачатку.

†

Аўтар: кс. Ян Раманоўскі
19.01.2014 00:00

